**НАТАТКІ ПА ВЫНІКАХ НАЗІРАННЯ ЗА СУДОВЫМ ПРАЦЭСАМ— АБСЕРВАТОРЫЯ**

# Беларусь: Прысуд лідарам незалежнага прафсаюзу: яшчэ адзін удар па свабодзе асацыяцыі

***Справа «Беларусь супраць Генадзя Фядыніча і Ігара Комліка»***



## Уводзіны

З 30 ліпеня па 17 жніўня 2018 году суд Савецкага раёна г. Мінска (Беларусь) разглядаў справу ў дачыненні да двух лідараў Беларускага незалежнага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП). Двум незалежным прафсаюзным лідарам, сп. **Генадзю Фядынічу** і **Ігару Комліку**, адпаведна старшыні і галоўнаму бухгалтару прафсаюза РЭП, было прад'яўленае абвінавачванне ва ўхіленні ад выплаты падаткаў у сувязі з тым, што ў 2011-2012 гадах яны, нібыта, атрымалі да 140 000 еўра на замежны банкаўскі рахунак у Літве, знялі дадзеныя сродкі і перапраўлілі наяўныя назад у Беларусь з дапамогай сваіх калегаў, а таксама ў сувязі з тым, што яны не задэкларавалі атрыманне дадзеных сродкаў у якасці даходу, што прывяло да нявыплаты падатку ў памеры 22 867 рублёў (каля 9 790 еўра). Рашэнне было вынесена 24 жніўня 2018 г. Падсудныя былі прызнаныя вінаватымі па ўсіх абвінавачваннях, прысуджаныя да чатырох гадоў абмежавання волі без турэмнага зняволення, пяці гадоў забароны на займанне кіруючых пасад і штрафу ў памеры 47 560 беларускіх рублёў (прыблізна 19 950 еўра).

Юрыст **Ілля Нузаў**, кіраўнік аддзела Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі ў FIDH, быў упаўнаважаны Абсерваторыяй па абароне праваабаронцаў для правядзення місіі назірання за судовым разглядам у судзе Савецкага раёна. Задача назіральніка заключалася ў ацэнцы справядлівасці судовага разбору ў святле нормаў міжнароднага права, у тым ліку замацаваных у артыкуле 14 (стандарты справядлівага судовага разбіральніцтва) і артыкулу 22 (свабода асацыяцыі) Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП), удзельніцай якога з'яўляецца Беларусь, а таксама

сустрэчах з падсуднымі, адвакатамі, прадстаўнікамі міжнародных прафсаюзаў, назіральнікамі ад дыпламатычных прадстаўніцтваў, беларускіх НДА і іншых міжнародных назіральнікаў, якія прысутнічалі на працэсе, абмеркаванне судовага працэсу, вызначэнне любых праблемаў у дачыненні да суда апроч ужо зафіксаваных назіральнікам, а таксама ацэнка становішча праваабаронцаў у краіне ў цэлым.

## Кароткая даведкавая інфармацыя

Становішча прафсаюзаў у Беларусі істотна не змянілася з савецкіх часоў, калі яны знаходзіліся пад строгім кантролем дзяржавы і кіруючай камуністычнай партыі[1]. Хоць распад Савецкага Саюза і аднапартыйнай сістэмы дазволілі сфарміраваць незалежныя прафсаюзы, улады прынялі абмежавальныя законы, якія перашкаджаюць іх стварэнню і дзейнасці. Напрыклад, 26 студзеня 1999 года прэзідэнт Лукашэнка падпісаў Дэкрэт № 2 "Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў", якім былі ўстаноўленыя сур'ёзныя абмежаванні на магчымасці па стварэнні або рэгістрацыі прафсаюзаў. Больш за тое, улады пастаянна ўмешваюцца ў дзейнасць незалежных прафсаюзаў, перашкаджаючы іх нармальнай працы, звальняючы актыўных сяброў і лідараў прафсаюзаў, а таксама прымушаючы радавых сяброў пакідаць незалежныя прафсаюзы і пераходзіць у кантраляваную дзяржавай Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі пад пагрозай звальнення ці адмовы ў заключэнні або працягу працоўных дамоваў[2].

16 чэрвеня 2000 года прафсаюз РЭП, разам з іншымі незалежнымі прафсаюзамі, накіраваў скаргу ў Камітэт па свабодзе аб'яднання Міжнароднай арганізацыі працы адносна парушэння Рэспублікай Беларусь асноватворных прынцыпаў, замацаваных у канвенцыях МАП. Камітэт па свабодзе аб'яднання ўстанавіў, што акты дзяржаўнага ўмяшання ў прафсаюзную дзейнасць недапушчальныя, і заклікаў урад прадаставіць інфармацыю аб ліквідацыі парушэнняў у дачыненні да канкрэтных прафсаюзных арганізацый і іх лідараў, уключаючы прафсаюз РЭП, які быў адным з прафсаюзаў, згаданых у скарзе.

З таго часу прадстаўнікі і сябры незалежных прафсаюзных арганізацый падвяргаліся яшчэ большай дыскрымінацыі, ціску, адмовах у працаўладкаванні пасля заканчэння тэрміну паўнамоцтваў на абраных прафсаюзных пасадах і іншых формаў ціску і пераследу з боку ўладаў. Напрыклад, 12 сакавіка 2001 года прэзідэнт падпісаў Дэкрэт № 8, пазней дапоўнены дэкрэтам № 24 ад 28 лістапада 2003 года "Аб атрыманні і выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі», якія зрабілі практычна немагчымым атрыманне беларускімі НДА і прафсаюзамі, якія займаюцца праваабарончай і сацыяльнай дзейнасцю, якой-небудзь альбо бязвыплатнай фінансавай дапамогі ад замежных дзяржаваў, арганізацый ці асобных асоб. Дэкрэт не разглядае прадастаўленне юрыдычнай дапамогі або любой праваабарончай дзейнасці як дапушчальнае выкарыстанне такіх сродкаў і прама забараняе выкарыстанне сродкаў для арганізацыі дэманстрацый і іншых формаў палітычнага пратэсту[3]. Абсерваторыя нагадвае, што гэта супярэчыць міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека, якія вызначаюць, што права на атрыманне фінансавання, у тым ліку з замежных крыніц, з'яўляецца асноўнай часткай права на свабоду асацыяцыі[4].

Становішча незалежных прафсаюзаў пагоршылася пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года, калі грамадзянская супольнасць падвергнулася беспрэцэдэнтным рэпрэсіям пасля масавых сацыяльных акцый пратэсту. Падчасператрусу ў цэнтральным офісе прафсаюза РЭП 14 студзеня 2011 года ўлады

---

[1] Даклад FIDH і ПЦ «Вясна» «Паўсюдныя парушэнні працоўных правоў і прымусовая праца ў Беларусі», снежань 2013 года, стр. 22

[2] Там жа, стр. 23

[3] Дэкрэт № 24 от 28 лістапада 2003 года, п. 4

[4] См. The Observatory, Annual Report 2013, “Violations of the right of NGOs to funding: from harassment to criminalisation”, http://www.omct.org/files/2013/02/22162/obs_annual_report_2013_uk_web.pdf

канфіскавалі амаль усе кампутары прафсаюза, якія пазней былі вернутыя ў непрацоўным стане. Канфіскацыя кампутараў дазволіла органам бяспекі, такім як КДБ, і іншым органам, адказным за ідэалагічную працу з прафсаюзнымі працоўнымі, устанавіць імёны многіх яго сябраў[5].

Вясной 2017 года прафсаюз РЭП раскрытыкаваў чарговы прэзідэнцкі Дэкрэт № 3 "Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства", якім устанаўліваўся збор з беспрацоўных, і які часткова і прывёў да масавых пратэстаў па ўсёй краіне. Прафсаюз РЭП сабраў больш за 45 000 подпісаў за адмену Дэкрэта, прымаў актыўны ўдзел у так званых «Маршах недармаедаў» і аказваў юрыдычную дапамогу актывістам, затрыманым у выніку іх удзелу ў акцыях пратэсту супраць Дэкрэта.

2 жніўня 2017 года супрацоўнікі Дэпартамента фінансавых расследаванняў (ДФР) Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі правялі ператрусы ў офісах прафсаюза РЭП, канфіскавалі дакументы і кампутары, а таксама затрымалі сп. Фядыніча і сп. Комліка. Хоць абодва яны былі ў канчатковым выніку вызваленыя (Комлік правёў два месяцы ў папярэднім зняволенні), ім было прад'яўлена абвінавачванне па ч. 2 арт. 243 Крымінальнага кодэкса ў сувязі з «ухіленнем ад выплаты падаткаў у буйным памеры». У адпаведнасці з артыкулам, абвінавачаныя маглі быць прысуджаныя да абмежавання волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўлення волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў і канфіскацыі маёмасці.

Гэта не першы выпадак, калі праваабаронцы ў Беларусі пераследуюцца па закону нібыта за ўхіленне ад выплаты падаткаў на атрыманне замежных сродкаў з дапамогай рахунка за мяжой. А менавіта, у 2011 годзе г-н **Алесь Бяляцкі**, старшыня Праваабарончага цэнтру "Вясна" і віцэ-прэзідэнт FIDH, быў абвінавачаны па тым жа артыкуле і пасля прысуджаны да чатырох з паловай гадоў пазбаўлення волі ў выніку судовага працэсу, які быў шырока асуджаны як палітычна матываваны і накіраваны на перашкоду яго працы ў якасці праваабаронцы[6]. Больш за тое, у 2014 годзе Камітэт па правах чалавека ААН прыйшоў да высновы, што вынясенне Алесю Бяляцкаму прысуду, звязанага з турэмным зняволеннем, стала прамым следствам парушэння яго права на свабоду асацыяцыі. Такім чынам, Камітэт звярнуўся да Беларусі з просьбай, у прыватнасці, прыняць меры для прадухілення аналагічных парушэнняў у будучыні, а менавіта шляхам перагляду свайго заканадаўства для забеспячэння яго адпаведнасці патрабаванням артыкула 22 МПГПП. Прынятыя Камітэтам Меркаванні былі цалкам праігнараваныя Беларуссю, як на ўзроўні палітычных рашэнняў, так і на практыцы ў дачыненні да незалежных аб'яднанняў. Да цяперашняга часу існуе заканадаўства, якое значна абмяжоўвае дзейнасць арганізацый грамадзянскай супольнасці, змушаючы многія арганізацыі рэгістравацца за мяжой.

## Судовы працэс

Разгляд справы пачаўся 30 ліпеня 2018 году судом Савецкага раёна ў складзе адзінай суддзі **Марыны Фёдаравай**. Абодва абвінавачаныя прысутнічалі на працягу ўсяго разбору, знаходзячыся на лаве ў першым шэрагу залы, адведзенага для публікі; у дачыненні да іх не ўжываліся такія сродкі, як кайданкі або змяшчэнне ў абмежаваную прастору, у прыватнасці металічныя клеткі, размешчаныя ў зале суда. Кожны з абвінавачаных быў прадстаўлены адвакатам: сп. Фядыніч быў прадстаўлены сп. **Наталляй Мацкевіч**, а сп. Комлік быў – сп. **Людмілай Казак**. Генеральную пракуратуру прадстаўлялі два старэйшых памочніка пракурора: сп. **Вадзім Казей** і сп. **Ірына Арлоўская**. Больш за 50 прадстаўнікоў грамадскасці прысутнічалі ў першы дзень судовага разбору, уключаючы журналістаў, прадстаўнікоў міжнародных арганізацый і замежных амбасадаў, а таксама праваабаронцаў і актывістаў. На працягу двух тыдняў судовага працэсу слуханні штодня наведвалі ад 20 да 40 чалавек.

---

[5] Там жа, стр. 28

[6] Гл., напрыклад, «Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента па Беларусі: арышт праваабаронцы Алеся Бяляцкага», 14 верасня 2011 г., https://spring96.org/ru/news/45716

На думку прадстаўнікоў уладаў, са студзеня 2011 года па сакавік 2012 году сп. Фядыніч і сп. Комлік, у мэтах самаузбагачэння і ў парушэнне, у прыватнасці, Дэкрэта прэзідэнта № 24 «Аб атрыманні і выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі» ад 28 лістапада 2003 года, уступілі ў змову з мэтай адкрыцця банкаўскага рахунку ад імя прафсаюза РЭП у банку AE SEB bankas у Вільні (Літва), што дазволіла ім здымаць сродкі, атрыманыя ад замежных арганізацый, такіх як дацкі прафсаюз 3F, і перапраўляць іх на тэрыторыю Беларусі без дэклaравання у падаткавых органах і рэгістрацыі ў якасці «замежнай бязвыплатнай дапамогі» ў адпаведным дзяржаўным органе. Як следства, абвінавачаныя не паведамілі аб 140 000 еўра даходу, што з'яўляецца парушэннем часткі 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь у сувязі з нявыплатай прафсаюзам РЭП падатку за 2011 фінансавы год у памеры 22 867 беларускіх рублёў. Падсудныя адмаўлялі ўсе абвінавачанні, а сярод сваіх довадаў яны падкрэслілі той факт, што абвінавачанне не змагло ўстанавіць наяўнасць рахунка ў замежным банку і атрыманне на яго сродкаў, за выключэннем удзелу прафсаюза РЭП у канферэнцыях і семінарах за мяжой, або перавозку якіх-небудзь сродкаў з Літвы у Беларусь на працягу адпаведнага перыяду. Абвінавачаныя таксама сцвярджалі, што адпаведнае заканадаўства і абвінавачванне супярэчаць прымяняльнаму міжнароднаму праву, якое датычыцца свабоды асацыяцыі.

Судовы працэс працягваўся 15 дзён і уключаў паказанні 27 сведкаў і экспертаў, разгляд 11 тамоў пісьмовых матэрыялаў і запісаў тэлефонных званкоў, а таксама паказанні падсудных.

## Прысуд

Сваім рашэннем, абвешчаным 24 жніўня 2018 года, суд Савецкага раёна вызначыў, што сп. Фядыніч і сп. Комлік прызнаныя вінаватымі ў парушэнні часткі 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса, і прысудзіў іх да чатырох гадоў абмежавання волі без накіравання ў выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу, пяці гадоў забароны на займанне кіруючых пасад і штрафу ў памеры 47 560 беларускіх рублёў (прыблізна 19 950 еўра).

## Прымянальнае міжнароднае права

Артыкул 14 МПГПП, ратыфікаванага Беларуссю, прадугледжвае, што ўсе асобы роўныя перад судом і што кожны абвінавачаны мае права на справядлівы і публічны разбор справы кампетэнтным, незалежным і неперадузятым судом, створаным на падставе закона. Сярод іншага, пункт 3 таксама прадугледжвае, што абвінавачаны мае права: “мець дастатковы час і магчымасці для падрыхтоўкі сваёй абароны і зносіцца з абраным ім самім абаронцам; апытваць сведкаў, якія паказваюць супраць яго, або мець права на тое, каб гэтыя сведкі былі дапытаныя, і мець права на выклік і допыт яго сведак на тых жа ўмовах, якія існуюць для сведак, якія паказваюць супраць яго”. Акрамя таго, артыкул 22 МПГПП гарантуе “права на свабоду асацыяцыі з іншымі, уключаючы права ствараць прафсаюзы і ўступаць у такія для абароны сваіх інтарэсаў”. Абмежаванні гэтага права прымальныя толькі ў тым выпадку, калі яны прадугледжаныя законам і неабходныя ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі або грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, абароны грамадскага здароўя або маралі або абароны правоў і свабодаў іншых асобаў. Нішто не дае права дзяржавам-удзельніцам Канвенцыі № 87 МАП прымаць заканадаўства ва ўрон гарантыям, прадугледжаных Канвенцыяй, або ўжываць закон такім чынам, які б прымяншаў гэтыя гарантыі. У адпаведнасці з артыкулам 3 Канвенцыі МАП аб свабодзе аб'яднанняў і абароне права аб'ядноўвацца ў прафсаюзы (Канвенцыя № 87), якую Беларусь ратыфікавала, органам улады варта ўстрымлівацца ад усялякага ўмяшання, здольнага абмежаваць або перашкодзіць законнаму ажыццяўленню права арганізацый работнікаў і працадаўцаў выпрацоўваць свае статуты і адміністрацыйныя рэгламенты, свабодна выбіраць сваіх прадстаўнікоў, арганізоўваць свой апарат і сваю дзейнасць і фармуляваць сваю праграму дзеянняў. Абарона прафсаюзаў і іх права ад умяшання ўладаў з'яўляецца гарантыяй права асобных асобаў на абарону сваіх эканамічных і сацыяльных інтарэсаў.

## Аналіз

Перш за ўсё варта адзначыць, што падсудныя, якія не знаходзіліся пад вартай да і падчас судовага разбору [пасля затрымання 2 жніўня 2017 г. Ігар Комлік правёў 2 месяцы ў следчым ізалятары - заўв. ПЦ "Вясна"], мелі шырокія магчымасці для сустрэч са сваімі адвакатамі і вывучэння, хоць і не капіявання, матэрыялаў справы да пачатку судовага разбору і прадстаўлення сваіх довадаў, накіравання хадайніцтваў і заяваў у судзе, а таксама магчымасці апытання сведак і пярэчанняў адносна формы і зместу пэўных частак паказанняў у ходзе разбору. Тым не менш, некаторыя аспекты судовага разбору ў значнай меры не адпавядалі стандартам справядлівасці, замацаваным у міжнародным праве, як падрабязна апісана ніжэй.

Па-першае, у ходзе разбору па меншай меры ад шасці са сведкаў, апытаных бакамі, паступілі скаргі, што іх дасудовыя паказанні, якія інкрымінуюць абвінавачаным, былі атрыманы шляхам пагрозаў, запалохвання і іншага псіхалагічнага ціску з боку супрацоўнікаў ДФР на этапе дазнання, якія мелі месца у перыяд каля 2 жніўня 2017 года, а таксама супрацоўнікамі Следчага камітэта ў ходзе наступных допытаў. Напрыклад, некалькі сведак паведамілі, што ім прама ці ўскосна, напрыклад, шляхам выкліку канвою, пагражалі арыштам і/або турэмным тэрмінам, калі пэўная вэрсія падзеяў, прадстаўленая следчым, не будзе прынятая. Некаторыя сведкі паведамілі, што іх больш ранція паказанні былі няправільна запісаныя.

9 жніўня 2018 года суддзя Фёдарава даручыла правесці праверку ў сувязі са скаргамі аб псіхалагічным ціску на сведак, якія змянілі свае паказанні ў судзе. Некалькі сведак былі выкліканыя для дадатковага допыту. Даволі дзіўным выглядае той факт, што адна са сведак, паўторна апытаная падчас праверкі, заявіла, што на яе не аказвалі ніякага ціску. Наадварот, яна раней паказала падчас апытання ў ходзе працэсу, што яна была платным інфарматарам КДБ. Няясна, ці былі апытаны ў ходзе праверкі хто-небудзь з супрацоўнікаў ДФР або Следчага камітэта. 14 жніўня 2018 года суддзя Фёдарава абвясціла, што праверка не выявіла якіх-небудзь парушэнняў з боку прадстаўнікоў уладаў.

Па-другое, у той час як толькі нешматлікія з 27 сведак валодалі якой-небудзь інфармацыяй пра факты, якія мелі месца на працягу інкрымініруемага перыяду, ім было дазволена даваць паказанні, нягледзячы на пярэчанні абароны. Больш за тое, пераважная колькасць пярэчанняў, прад'яўленых абаронцамі ў гэтым і іншых выпадках не былі задаволеныя без якіх-небудзь тлумачэнняў прычын такіх рашэнняў, што дазваляе выказаць здагадку магчымасць прадузятага стаўлення і, такім чынам, адсутнасць незалежнасці з боку суддзі Фёдаравай.

Па-трэцяе, справа мела шмат шматлікіх працэсуальных парушэнняў. Абвінавачванне было пабудавана на двух ключавых дакументальных доказах, якія былі атрыманы нявызначаным спосабам у выніку неўстаноўленых і непразрыстых працэсуальных дзеянняў. Першым доказам была меркаваная раздрукоўка банкаўскіх запісаў, якая пацвярджае наяўнасць карпаратыўнага рахунка ў літоўскім банку і рух грашовых сродкаў ад замежных арганізацый. Апошняе не было пацверджана дадзеным банкам. Другі доказ — уліковы запіс электроннай пошты, якая утрымоўвала гэтыя банкаўскія запісы, а таксама электронныя лісты, якія інкрымінуюцца, ад меркаваных замежных спонсараў, такіх як дацкі прафсаюз 3F. Аднак у ходзе судовага разбору абвінавачванне не прадставіла доказаў сувязі дадзенага адраса электроннай пошты ні з адным з падсудных. Падчас Skype-апытання супрацоўніка фінансавай міліцыі Сяргея Дзмітрыева, якому дазволілі не з'явіцца на судовае паседжанне па сумніўных прычынах бяспекі, у выніку чаго прысутныя не маглі бачыць яго твару, сведка адмовіўся даць якую-небудзь канкрэтную інфармацыю аб тым, як былі сабраныя доказы або як быў ажыццёўлены доступ да ўліковага запісу электроннай пошты, спасылаючыся ў агульных рысах на «аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы». Такім чынам, не было прадастаўлена інфармацыі ні аб IP-адрасе, які быў выкарыстаны для стварэння ўліковага запісу электроннай пошты, устанаўлення ўладальніка ўліковага запісу электроннай пошты і даты стварэння акаўнта

электроннай пошты. Гэтыя факты аказваюць вялікі ўплыў на дакладнасць і, такім чынам, каштоўнасць такіх доказаў, асабліва таму, што ўлады Летувы не далі інфармацыі аб банкаўскіх рахунках, якія належалі сп. Комліку і Фядынічу, альбо прафсаюзу РЭП.

Акрамя таго, у ходзе разбіральніцтва высветлілася, што пастанова аб кантролі тэлефонных размоў сп. Комліка і сп. Фядыніча было санкцыянавана судом 15 ліпеня 2017 года. Аднак са стэнаграм тэлефонных размоў, якія былі прынятыя судом у якасці доказаў, становіцца зразумела, што яны былі запісаныя да гэтай даты, што паказвае на тое, што яны былі атрыманы незаконна і павінны былі быць канфіскаваныя з пратаколу судовага паседжання.

Дадзеныя працэсуальныя парушэнні, якія суд не прыняў пад увагу ў інтарэсах абвінавачвання, прывялі да несправядлівай перавазе для дзяржаўных органаў у выглядзе ненадзейных і ня правераных доказаў, якія, верагодна, былі атрыманы незаконнымі сродкамі, парушылі прынцып роўнасці бакоў і перашкодзілі падсудным падрыхтаваць адэкватную абарону. У сукупнасці гэтыя парушэнні дэманструюць, што судовы разгляд не адпавядаў стандартам справядлівасці, замацаваным у артыкуле 14 МПГПП.

Больш за тое, інкрымінуемыя дзеянні і дзейнасць прафсаюза РЭП у цэлым павінны разглядацца ў гістарычным кантэксце і ў кантэксце заканадаўства Беларусі, накіраванага супраць дзейнасці асацыяцый насуперак нормам міжнароднага права. У адпаведнасці з артыкулам 22 МПГПП, заканадаўчае ўмяшальніцтва ў права на стварэнне асацыяцыі можа быць апраўдана толькі ў тым выпадку, калі яно прапарцыйна праследуемай законнай мэты. Гэта азначае, што для абгрунтавання ўмяшання павінны быць прадастаўлены асабліва пераканаўчыя прычыны. Акрамя таго, згодна з міжнародным стандартам, права на доступ да фінансавання з'яўляецца неад'емнай часткай права на свабоду асацыяцыі, якое само па сабе з'яўляецца агульнапрызнаным правам, замацаваным у шматлікіх міжнародных і рэгіянальных дакументах. З прававога пункту гледжання законнымі абмежаваннямі на права доступу да фінансавання з'яўляюцца тыя ж падставы, якія дапускаюцца ў дачыненні да права на свабоду асацыяцыі: яны дазволеныя толькі пры захаванні строгіх і сумарных умоваў. Яны павінны быць «прадпісаны законам» і «неабходныя ў дэмакратычным грамадстве», а таксама паважаць перавагу грамадскіх інтарэсаў і прынцып прапарцыянальнасці.

Сапраўды, Працоўная група ААН па адвольных затрыманнях у сваім меркаваннем па справе Алеся Бяляцкага, звязанага з ідэнтычнымі абвінавачваннямі, вызначыла, што артыкул 22 утрымлівае не толькі негатыўныя абавязацельствы дзяржаў не ўмешвацца ў дзейнасць арганізацый грамадзянскай супольнасці, але таксама і пазітыўныя абавязацельствы па садзейнічанню мэтам асацыяцый па сродкам дзяржаўнага фінансавання або вызвалення ад падаткаў на сродкі, атрыманыя асацыяцыямі ад замежных дзяржаў ці арганізацый[7].

Дэкрэт № 24 "Аб атрыманні і выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі" ад 28 лістапада 2003 года, ігнараванне якога неаднаразова згадвалася абвінаваўцамі падчас судовага разбору як падстава для меркаванай схемы, выкарыстанай абвінавачанымі, супярэчыць стандартам, выкладзеных у артыкуле 22 МПГПП, а таксама ў Канвенцыі № 87. Пералік дапушчальнага выкарыстання такой замежнай дапамогі ў Дэкрэце не ўключае ў сябе дзеянні, звязаныя з абаронай і заахвочваннем правоў чалавека, а любая спроба зарэгістраваць атрыманне такіх сродкаў сувязі, верагодна, прывядзе да іх канфіскацыі або да сур'ёзных абмежаванняў на іх выкарыстанне. Гэта абмежаванне вельмі абцяжарвае магчымасці прафсаюза РЭП і іншых арганізацый грамадзянскай супольнасці атрымліваць публічнае фінансаванне і, такім чынам, валодаць дастатковымі рэсурсамі для эфектыўнага кіравання сваёй дзейнасцю, асабліва ў галіне аказання юрыдычнай і сацыяльнай

[7] Савет па правах чалавека ААН, Працоўная група па адвольных затрыманнях, Меркаванні, прынятыя Працоўнай групай па адвольных затрыманнях на яе шэсцьдзесят чацвёртай сесіі 27-31 жніўня 2012 года, Меркаванне № 39/2012 (Беларусь)

дапамогі актывістам і праваабаронцам. Таму ўмяшанне дзяржавы стварае сур'ёзныя абмежаванні ў выбары дзейнасці прафсаюза РЭП і іншых прафсаюзаў, а таксама ў аб'ёме іх фінансавых магчымасцяў. З іншага боку, дзяржаўныя органы не прапанавалі і не могуць прапанаваць якой-небудзь законнай мэты, якую праследвае такое заканадаўства, што робіць іх умяшанне залішнім і, такім чынам, несуразмерным любой законнай сацыяльнай патрэбе.

**Вынікі**

24 жніўня 2018 году сп. Генадзь Фядыніч і сп. Ігар Комлік, адпаведна старшыня і галоўны бухгалтар Беларускага незалежнага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП), былі прызнаныя вінаватымі ва ўхіленні ад выплаты падаткаў судом Савецкага раёна г. Мінска (Беларусь). Абвінавачванне сцвярджала, што абодва лідара незалежнага прафсаюзу вінаватыя ў тым, што яны не задэкларавалі 140 000 еўра, нібыта атрыманых на карпаратыўны банкаўскі рахунак у Літве. Абвінавачванні былі прад'яўленыя ім праз год пасля таго, як прафсаюз дапамог мабілізаваць акцыі пратэсту супраць прэзідэнцкага Дэкрэта № 3, якім устанаўліваўся збор з беспрацоўных.

Абсерваторыя па абароне праваабаронцаў даручыла правесці місію назірання за працэсам 30 ліпеня 2018 года, у дзень пачатку судовага разбору. Пры садзейнічанні Праваабарончага цэнтру "Вясна" Абсерваторыя ўважліва сачыла за працэсам да абвяшчэння канчатковага рашэння, якім сп. Фядыніч і сп. Комлік былі прысуджаныя да чатырох гадоў абмежавання волі без турэмнага зняволення, пяці гадоў забароны на займанне кіруючых пасад і штрафу ў памеры 47 560 беларускіх рублёў.

Аўтар дакладу прыйшоў да высновы аб тым, што ў ходзе судовага разбіральніцтва былі здзейсненыя сур'ёзныя працэсуальныя парушэнні, што прывяло да парушэння права сп. Фядыніча і сп. Комліка на справядлівае судовае разбіральніцтва. Па-першае, шасцёра сведак заявілі ў судзе, што іх паказанні былі атрыманы з выкарыстаннем пагроз і псіхалагічных катаванняў. Па-другое, у якасці асноўных доказаў абвінавачанне прадставіла непацверджаныя банкаўскія запісы, атрыманыя з дапамогай уліковага запісу электроннай пошты, прыналежнасць якой не была устаноўленая ў ходзе судовага разбору. Па-трэцяе, суд прыняў у якасці доказу стэнаграмы тэлефонных размоваў, запісаных да атрымання санкцыі на кантроль тэлефонных размоваў сп. Фядыніча і сп. Комліка.

Гэтыя працэсуальныя парушэнні прывялі да парушэння прынцыпу роўнасці бакоў, што дало абвінавачванню перавагу ў выглядзе непраўдзівых і непацверджаных доказаў, якія, верагодна, былі атрыманы з выкарыстаннем незаконных сродкаў.

Судовае разбіральніцтва варта аналізаваць у больш шырокім кантэксце сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. У 2011-2014 гадах Алесь Бяляцкі, старшыня Праваабарончага цэнтру "Вясна" і віцэ-прэзідэнт FIDH, правёў тры гады ў турме ў выніку аналагічнага палітычнага матываванага судовага працэсу па абвінавачванню ва ўхіленні ад выплаты падаткаў. Пасля ААН назвала яго турэмнае зняволенне адвольным і заклікала ўлады выплаціць Алесю Бяляцкаму кампенсацыю, а таксама рэфармаваць нацыянальнае заканадаўства, якое рэгулюе свабоду асацыяцыі. Ні адно з патрабаванняў ААН не было выканана беларускімі ўладамі. Незалежную грамадзянскую супольнасць, у тым ліку незалежныя прафсаюзы, працуюць ва ўмовах рэпрэсіўнага заканадаўства, якое было прынята з мэтай ліквідацыі крытыкі ў адрас дзяржавы. У кантэксце масавых акцый пратэсту ўвесну 2017 года ўзбуджэнне крымінальнай справы супраць прафсаюза РЭП у жніўні 2017 года азначае, што яго праслед, хутчэй за ўсё, з'яўляецца пакараннем за яго ролю ў выніковым прыпыненні дзеяння Дэкрэта № 3 аб беспрацоўных і часткова занятых.

**Таму Абсерваторыя лічыць, што асуджэнне сп. Фядыніча і сп. Комліка парушае міжнародныя прававыя абавязацельствы Беларусі ў галіне правоў чалавека, а таксама Канстытуцыю краіны, і што абвінаваўчыя прысуды павінны быць адменены ў ходзе апеляцыі.**

*Абсерваторыя па абароне праваабаронцаў (абсерваторыя) была створаная ў 1997 годзе FIDH і Сусветнай арганізацыяй супраць катаванняў (ОМСТ). Мэта праграмы — умяшальніцтва з мэтай прадухілення або ліквідацыі сітуацый рэпрэсій супраць праваабаронцаў. FIDH і ОМСТ з'яўляюцца сябрамі* ProtectDefenders.eu*, механізму па абароне праваабаронцаў Еўрапейскага саюза, якое ажыццяўляецца міжнароднай грамадзянскай супольнасцю.*